**Рашэнне аргкамітэта партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя ад 17.01.2022**

З прычыны таго, што ў Беларусі прыняты закон аб крымінальнай адказнасці за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацыі, сход аргкамітэта партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя заяўляе, што наша дзейнасць вядзецца поўнасцю ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і ўключае ў сябе выключна мерапрыемствы, якія адпавядаюць беларускаму заканадаўству, у межах падрыхтоўкі да рэгістрацыі партыі.

Аргкамітэт партыі БХД правёў сход заснавальнікаў партыі, на якім прыняў рашэнне, у адпаведнасці з законам РБ "Аб палітычных партыях" аб правядзенні неабходных падрыхтоўчых мерапрыемстваў для рэгістрацыі палітычнай партыі, а менавіта:

- падрыхтоўкі да правядзення ўстаноўчага з'езда партыі

- падрыхтоўкі статута партыі

- падрыхтоўкі праграмы партыі

- падрыхтоўцы спісу заснавальнікаў партыі і іншых неабходных дакументаў для рэгістрацыі партыі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Плануем правесці на працягу бліжэйшага часу рэгіянальныя сходы заснавальнікаў, на якіх абмеркаваць статут, праграму, назву, сімволіку і гімн партыі, а таксама абмеркаваць прымальную дату правядзення ўстаноўчага з'езда і вылучыць дэлегатаў на ўстаноўчы з'езд партыі.

Прапанаваць устаноўчаму з'езду прыняць у якасці назвы партыі: Партыя "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя".

Прапанаваць у якасці гімна партыі выкарыстоўваць гімн "Магутны Божа".

Даручыць Дзянісу Садоўскаму каардынацыю і падрыхтоўку ўсіх неабходных устаноўчых дакументаў, у тым ліку статут, праграму, спіс заснавальнікаў партыі.

Даручыць Анатолю Міхнаўцу каардынацыю і падрыхтоўку спісу заснавальнікаў партыі, з ліку грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца за мяжой.

Прызваць грамадзян Рэспублікі Беларусь прыняць удзел у стварэнні партыі, прыняць удзел у абмеркаванні праграмы і статута партыі.

Заснавальнікі аргкамітэта партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя заяўляюць аб недапушчальнасці дзеянняў ад імя аргкамітэта БХД, якія могуць тлумачыцца як дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі – любымі структурамі ці асобнымі грамадзянамі. У выпадку падобных дзеянняў кім-небудзь з заснавальнікаў партыі, з мэтай недапушчэння пагрозы абвінавачання іншых заснавальнікаў у дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі, такія асобы аўтаматычна выключаецца са спісу заснавальнікаў аргкамітэта партыі БХД.